# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА К. С. АКАЛОВІЧ



**Падпольшчыкі групы К. С. Акаловіч**
Злева направа: А. І. Лявонава, Л. С. Лявонава, Г. К. Вішнеўская, В. І. Чыркоў, К. С. Акаловіч, М. А. Кузняцова

**Перыяд дзеяння:**

ліпень 1941 г. – сакавік 1943 г.

**Месца дзеяння:**

медыцынскія ўстановы г. Віцебска

**Колькасць:**

15 чалавек

**Кіраўнікі:**

Акаловіч Ксенія Сяргееўна

Дзейнічала з ліпеня 1941 г. да сакавіка 1943 г. у медыцынскіх установах горада. Налічвала 15 чалавек. Кіраўнік – урач туберкулёзнай бальніцы Ксенія Сяргееўна Акаловіч.

У каманду ўваходзілі Т. М. Шырачэнка, Т. К. Вішнеўская, Т. Бігус, І. Альшанка, Л. С. Лявонава, Т. К. Бельская і іншыя. Кіраўнік групы выкарыстоўвала пашпарты памерлых, гісторыі хвароб, бланкі розных даведак, каб аформіць каля сотні дакументаў для выратавання ваеннапалонных, камуністаў, асоб яўрэйскай нацыянальнасці, разведчыкаў і сувязных, моладзі ад вывазу ў Германію.

К. С. Акаловіч і Т. М. Шырачэнка размяшчалі ў бальніцы воінаў Чырвонай арміі, якія апынуліся ў тыле ворага, потым пераводзілі іх на канспіратыўныя кватэры, далечвалі, а Т. К. Вішнеўская дапамагала выйсці з горада. К. С. Акаловіч перапраўляла з горада не толькі ваеннапалонных, але і мірных жыхароў, у першую чаргу тых, каму пагражала небяспека. Так, з дапамогай Акаловіч былі легалізаваны армейскі разведчык В. І. Чыркоў і радыстка М. Кірухіна з разведгрупы М. Р. Яфімава («Армейца»).

Пад выглядам наведвання хворых К. Акаловіч і М. Кірухіна збіралі ў горадзе звесткі аб размяшчэнні штабоў, складоў, абарончых збудаванняў, зенітных установак. Здабытыя разведданыя, медыкаменты, перавязачны матэрыял падпольшчыкі перадавалі аператыўна-чэкісцкай групе А. А. Максіменкі, партызанскай брыгадзе «Аляксея».




**У гады вайны тут знаходзілася асноўная яўка групы медработнікаў горада, якую ўзначальвала галоўны ўрач тубдыспансера Ксенія Акаловіч**

Крыніца фотаздымка: «Таямніцы Віцебска»

У красавіку 1942 г. патрыёты вывелі да партызан групу ваеннапалонных, у маі Акаловіч прывяла да іх яшчэ каля 30 чалавек. Невыпадкова А. А. Максіменка цераз Вярбіцкага ў чэрвені 1942 г. прасіў папярэдзіць Ксенію Сяргееўну аб большай канспіратыўнасці ў рабоце на партызан і фактычна забараніў ёй хадзіць побач з тымі, хто пакідаў горад.

У жніўні 1942 г. пад пагрозай правалу Акаловіч і некаторыя падпольшчыкі пайшлі ў партызаны. Тыя, што засталіся ў горадзе, працягвалі працаваць пад кіраўніцтвам Т. М. Шырачэнка, якая 20 мая 1942 г. асабіста суправаджала да партызан групу колькасцю звыш 30 чалавек (пераважна камуністы і іх сем'і); сярод іх быў і сакратар Чыгуначнага РК КП(б)Б І. Грыгор'еў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Акаловіч К. С. / Н. І. Дарафеенка, М. У. Дарафеенка // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1990. – С. 130.

2. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група К. С. Акаловіч / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 478–479.

3. **Коммунисты** собирают силы // Витебское подполье / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко. – Минск, 1969. – С. 40–56.

4. **Подпольная** группа Околович К. С. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 293–294.